УДК 378.662(476):37.013:808.26

М.В. Трус
(БДТУ, Мінск)

# СІСТЭМНАСЦЬ ВЫХАВАЎЧАЙ ПРАЦЫ КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ БДТУ

За 20 гадоў свайго існавання кафедрай беларускай філалогіі (да 2012 г. яна называлася кафедрай беларускай мовы) назапашаны вялікі вопыт выхаваўчай працы, прадстаўлены і на агульнатэарэтычным, і на практычным узроўнях. У многім гэты вопыт падсумаваны ў наступных выданнях: матадычным дапаможніку В.А. Кузьміч “Развіццё і рэалізацыя ідэй Канцэпцыі і Праграмы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі” (2004), метадычных рэкамендацыях “Планаванне ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў ВНУ” (2010), падрыхтаваных В.А. Кузьміч і Т.У. Жукоўскай, метадычных рэкамендацыях “Арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай працы ва ўстановах вышэйшай адукацыі” (2013), падрыхтаваных В.А. Кузьміч і М.В. Трусам.

Пералічаныя кнігі сталі лагічнымі звёнамі падсумавання кафедральных ініцыятыў, а таксама запатрабаваным складнікам у агульнаўніверсітэцкай парадыгме рознажанравых друкаваных прац, адрасаваных выкладчыкам і куратарам студэнцкіх груп па арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў па грамадзянска-патрыятычным, прававым і экалагічным выхаванні студэнцкай моладзі, прафілактыцы правапарушэнняў.

У выданнях прадстаўлены комплекс матэрыялаў: нарматыўныя дакументы, якімі павінен кіравацца куратар у сваёй прафесійнай дзейнасці; прыкладны разгорнуты план ідэалагічнай і выхаваўчай працы на вучэбны год; метадычныя рэкамендацыі па планаванні і арганізацыі мерапрыемстваў. Мяркуем, кафедральны вопыт, інфарматыўная напоўненасць выданняў, іх практычная важкасць будуць карыснымі не толькі ў практыцы БДТУ, але і ўсіх устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Названыя кнігі не падвялі заключную рысу пад вопытам выхаваўчай працы. Кафедра сістэматычна дзеліцца сваімі напрацоўкамі з зацікаўленай грамадскасцю на старонках рэспубліканскіх СМІ (“СБ. Беларусь сегодня”, “Полымя”, “Настаўніцкая газета”, “Літаратура і мастацтва” і інш.), падтрымлівае цеснае супрацоўніцтва з навуковым і метадычным часопісам “Роднае слова”, уключаным у пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь. Толькі ў 2015 г. у рэспубліканскіх і замежных СМІ былі апублікаваны 22 артыкулы аб пазітыўным вопыце структурнага падраздзялення, на сайце БДТУ змешчаны 17 інфармацыйных паведамленняў аб дзейнасці кафедры.

У многім выхаваўчая праца кафедры беларускай філалогіі арганізуецца праз дзейнасць студэнцкага навуковага аб’яднання “Пошук” (уклю-

чае некалькі гурткоў) і літаратурнага клуба "Ветліца", якія паводле статыстыкі вынікаў 2015 г. ахопліваюць 157 удзельнікаў.

У 2015 г. былі арганізаваны 4 студэнцкія навукова-практычныя канферэнцыі, на якіх быў прадстаўлены 81 даклад:

1. "Беларусь – зямля маіх бацькоў, мая зямля" (20.04.2015).
2. "Русский язык – путь к знаниям" (24.04.2015).
3. "Скарбы спадчыны духоўнай" (25.04.2015).
4. "Равеснікі стагоддзя" (12.12.2015).

За лепшыя даклады на 66-й навукова-практычнай студэнцкай канферэнцыі граматамі БДТУ ўзнагароджаны 6 студэнтаў. У межах канферэнцыі апублікавана 5 артыкулаў.

Студэнцкія работы (283) накіраваны на конкурсы розных узроўняў:

– на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых прац прадстаўлены 3 студэнцкія навуковыя работы;

– на Міжнародны конкурс студэнцкіх навуковых работ "Моладзь і паліграфія" (Украіна) накіравана 1 работа (атрыманы Дыплом II ступені);

– на ўніверсітэцкі конкурс навукова-даследчых і творчых работ студэнтаў і магістрантаў па грамадскіх і гуманітарных навуках, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі і 85-годдзю БДТУ, прадстаўлена 279 работ.

Кафедра арганізуе ўдзел студэнцкай моладзі ў рэспубліканскім творчым конкурсе "Аўтограф" (праводзіцца адзін раз у два гады). На апошнія два форумы (2012, 2014 гг.) былі прадстаўлены 93 работы (I катэгорыя – 1; II кат. – 9; III кат. – 3).

Наведванне музеяў, арганізацыя культпаходаў у культурна-асветніцкія ўстановы г. Мінска – абавязковая праграма для студэнтаў усіх факультэтаў. Асноўныя экскурсійныя маршруты: "Мінск – ты ў сэрцы маім"; "Масленіца ў батанічным садзе"; Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь; "Галерэя" (мастацтва, народныя промыслы).

Пры навучанні замежных навучэнцаў рускай мове рэалізоўваліся выхаваўчыя мэты, прадугледжаныя Дзяржаўным адукацыйным стандартам: 1) фарміравалася паважлівае стаўленне да рускай мовы як сродку міжкультурных дзяржаўных зносін; 2) фарміраваліся дабразычлівыя адносіны да носьбітаў мовы; 3) фарміравалася сістэма маральных каштоўнасцяў і ацэначна-эмацыйныя адносіны да свету. Гэтаму спрыялі гутаркі выкладчыкаў, лінгвакраіназнаўчыя тэксты, азнаямленчыя экскурсіі па горадзе, у музеі, наведванне тэатраў.

Кафедра беларускай філалогіі заўсёды адкрыта для супрацоўніцтва з іншымі структурнымі падраздзяленнямі БДТУ, вышэйшымі навучальнымі і культурна-асветніцкімі ўстановамі нашай краіны і замежжа.